# ФОРМЫ І ВІДЫ РЭГУЛЯВАННЯ МАЁМАСНЫХ АДНОСІН У ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ У XVI–XVII стст.

**Д. А. Бодрыкава**

*ДУА «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы»*
*вул. Маскоўская, 15, 220007, г. Мінск, Беларусь, daria.alekseyuk@gmail.com*

Мэтай артыкула з'яўляецца вызначэнне форм і відаў рэгулявання маёмасных адносін у XVI–XVII стст. дзейснымі заканадаўчымі актамі Вялікага Княства Літоўскага. У даследаванні аналізуецца айчынная і замежная гістарыяграфія па адзначанаму пытанню. Вызначаецца эвалюцыя заканадаўчага рэгулявання адносін, звязаных з рухомай і нерухомай маёмасцю. Робіцца выснова аб фармалізацыі маёмасных адносін, звязанай з развіццём заканадаўства Вялікага Княства Літоўскага ў дадзены перыяд.

***Ключавыя словы:*** маёмасныя адносіны; Вялікае Княства Літоўскае; Статуты ВКЛ; заканадаўства.

# ФОРМЫ И ВИДЫ РЕГУЛИРОВАНИЯ ИМУЩЕСТВЕННЫХ ОТНОШЕНИЙ В ВЕЛИКОМ КНЯЖЕСТВЕ ЛИТОВСКОМ В XVI–XVII вв.

**Д. А. Бодрикова**

*ГУО «Республиканский институт высшей школы»*
*ул. Московская, 15, 220007, г. Минск, Беларусь, daria.alekseyuk@gmail.com*

Цель статьи является определение форм и видов регулирования имущественных отношений в XVI–XVII вв. действующими законодательными актами Великого Княжества Литовского. В исследовании анализируется отечественная и зарубежная историография по указанной проблеме. Определяется эволюция законодательного регулирования отношений, связанных с движимым и недвижимым имуществом. Сделан вывод о формализации имущественных отношений, связанной с развитием законодательства Великого Княжества Литовского в этот период.

***Ключевые слова:*** имущественные отношения; Великое Княжество Литовское; Статуты Великого Княжества Литовского; законодательство.

# FORMS AND TYPES OF REGULATION OF PROPERTY RELATIONS IN THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA IN THE 16$^{th}$–17$^{th}$ CENTURIES

**D. A. Bodrykava**

*SIE «National Institute for Higher Education»*
*Maskovskaya str 15, 220007, Minsk, Belarus, daria.alekseyuk@gmail.com*

The purpose of the article is to determine the forms and types of regulation of property relations in the 16$^{th}$–17$^{th}$ centuries by the effective legislative acts of the Grand Duchy of Lithuania. The research analyzes domestic and foreign historiography on the indicated issue.

The evolution of legislative regulation of relations related to movable and immovable property is determined A conclusion is made about the formalization of property relations associated with the development of the legislation of the Grand Duchy of Lithuania during this period.

***Keywords:*** property relations; Grand Duchy of Lithuania; statutes of the Grand Duchy of Lithuania; legislation.

Маёмасныя адносіны з'яўляюцца адной з неад'емных частак функцыянавання чалавечага грамадства на працягу ўсяго перыяду яго існавання. З развіццём грамадства пэўную эвалюцыю праходзяць і маёмасныя адносіны. З эвалюцыяй маёмасных адносін узнікае ўсё большая неабходнасць для рэгулявання гэтых адносін з боку дзяржаўнай улады. Калі першапачаткова рэгуляванне маёмасных адносін адбывалася на падставе норм звычаёвага права, то з развіццём феадальнага грамадства і прававых адносін ў ім з'яўляецца неабходнасць рэгулявання адносін з маёмасцю актамі заканадаўства.

Нашай мэтай з'яўляецца вызначэнне форм і відаў рэгулявання маёмасных адносін у дзейсных заканадаўчых актах Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ) XVI–XVII стст. — Статутах 1529, 1566 і 1588 гг., з улікам унесеных у іх у пазнейшы час змен. У адрозненні ад прывілейнага перыяду статутны перыяд больш дакладна акрэсліў сферу рэгулявання маёмасных адносін, бо ў дадзеных актах заканадаўчым механізмам такога рэгулявання прысвечаны асобныя сэнсавыя часткі (раздзелы).

Пад рэгуляваннем маёмасных адносін мы разумеем механізмы рэалізацыі правоў у дачыненні да рухомай і нерухомай маёмасці, замацаваныя заканадаўчымі актамі. З мэтай усебаковага аналізу маёмасных адносін варта звярнуцца як да заканадаўчага афармлення рэгулявання, так і да практыкі яго прымянення ў паўсядзённым жыцці розных катэгорый грамадства ВКЛ. У дадзеным артыкуле намі будзе закрануты тэарэтычны бок пытання рэгулявання маёмасных адносін, вызначаны формы і віды рэгулявання ў Статутах ВКЛ 1529, 1566 і 1588 гг.

Пытанні рэгулявання маёмасных адносін заканадаўствам ВКЛ закраналася ў манаграфіях як айчынных, так і замежных гісторыкаў права і юрыстаў, прысвечаных развіццю прававой думкі ў пэўныя перыяды гістарычнага развіцця на працягу апошняга стагоддзя. Азначанае пытанне закраналі ў сваіх манаграфіях Я. А. Юхо [7], Т. І. Доўнар [3], Г. В. Дзербіна [2], Ю. Бардах [1] і іншыя даследчыкі. У сваіх працах аўтары ў тым ліку ажыццявілі грунтоўны аналіз крыніц грамадзянскага права ВКЛ, якія закраналі рэгуляванне маёмасных адносін у грамадстве ў XVI–XVII стст., асаблівую увагу звяртаючы на тры Статуты ВКЛ, як найбольш дасканалыя помнікі феадальнага права азначанага перыяду.

На працягу XIV–XVI стст. паралельна з працэсамі кансалідацыі асобных земляў у складзе ВКЛ адбываецца працэс уніфікацыі права з актыўнай распрацоўкай новых прававых нормаў, якi адпавядалі зменам у сацыяльна-эканамічным развіцця дзяржавы. На думку Ю. Бардаха мэты кадыфікацыі і ўніфікацыі права ў еўрапейскіх дзяржавах у пачатку XVI ст. былі звязаны ў тым ліку з ажыўленнем навукі права і павелічэннем яе ўплыву на сістэму права, якая ўключала ў той час і судовую практыку [1, с. 72]. Даследчыкамі таксама адзначаецца значны ўплыў ідэй Рэнесансу на дадзеныя працэсы.

Першыя заканадаўчыя акты ВКЛ сведчылі яшчэ аб пэўнай асаблівасці ў рэгуляванні маёмасных адносін асобных тэрыторый Княства. Вялікі князь быў вымушаны лічыцца са старадаўнімі звычаямі асобных зямель пад час выдавання грамат пэўным тэрыторыям ВКЛ (Полацкай, Віцебскай, Смаленскай і іншым землям). Як адзначае Т. І. Доўнар у граматах асобным землям «без асаблівай паслядоўнасці маюць месца і грамадзянска-прававыя нормы, хаця і невялікая колькасць, бо маёмасныя праваадносіны ў асноўным рэгуляваліся звычаёвым правам» [4, с. 5]. Пераход да якасна новай сістэмы выкладання прававога матэрыялу (Статутны перыяд) дакладна вызначыў сферу маёмасных адносін.

Прааналізаваўшы Статуты ВКЛ 1529, 1566 і 1588 гг. намі былі вызначаны асноўныя віды рэгулявання маёмасных адносін у грамадстве ў XVI–XVII стст., а таксама асаблівасці гэтых відаў.

Сярод відаў рэгулявання маёмасных адносін у першую чаргу трэба азначыць атрыманне маёмасці ў спадчыну, якому ва ўсіх Статутах была нададзена асаблівая ўвага. У Статуце 1529 г. былі змешчаны асобныя артыкулы, якія рэгламентавалі атрыманне ў спадчыну. Так у раздзеле 4 «Аб спадчыннасці жанчынамі і аб выдачы дзяўчын замуж» вызначалася якім чынам спадчыну атрымліваюць удава і дзеці памерлага землеўласніка, а ў раздзеле 5 «Аб апекунах» вызначаліся некаторыя нормы складання тастаментаў. Таксама артыкулы чацвёртага раздзела прадугледжвалі правілы спадчыннасці або пазбаўленне ад яе ў выпадку паўторнага шлюбу жанчыны, выхаду замуж у іншыя дзяржавы, шлюбу без дазволу бацькоў, або пасля іх смерці без дазволу бліжэйшых родзічаў. Адзначаны раздзел таксама рэгламентаваў спадчыну бацькоўскіх і мацярызных маёнткаў.

У Статуце 1566 г., захаваўся раздзел «Аб апекунах», а раздзел які непасрэдна рэгуляваў спадчынныя маёмасныя адносіны набыў назву «Аб праве пасагу» (у адпаведнасці са Статутам 1588 г. «Аб праве пасагу і вене») і быў пашыраны. Так, быў дадзены артыкул, які тычыўся спадчыны дзяўчыны, якая вырашыла ўзяць шлюб з прадстаўніком іншага саслоўя. Акрамя таго ў Статут 1566 г. быў уведзены асобны раздзел 8 «Аб тастаментах», які

вызначаў парадак складання тастаменту, асоб якія маглі ствараць тастаменты і якія маглі атрымліваць маёмасць у спадчыну. Азначаны дадатковыя прычыны страты спадкаемцамі права на спадчыну.

У Статуце 1588 г. адзначаныя раздзелы былі пашыраны новымі артыкуламі, некаторыя іх нормы былі зменены або ўдакладнены. Так, раздзел аб пасагу і вене быў дапоўнены артыкулам, які вызначаў парадак падзелу маёмасці, набытай пры сумесным жыцці мужа і жонкі [6, р. 5, арт. 21]. Гэтым артыкулам муж і жонка ўпершыню ўключаліся заканадаўствам ў кола спадчыннікаў першай чаргі. У раздзеле «Аб тастаментах» Статута 1588 г. была пашырана кола асоб, якія не маглі складаць тастаменты, а таксама прычын, па якіх па якіх бацькі маглі адрачыся ад сваіх дзяцей і пазбавіць іх права на спадчыну, пашыраны патрабаванні да стварэння завяшчальных запісаў.

Яшчэ двума відамі рэгулявання маёмасных адносін, якія рэгламентаваліся вышэй азначанымі артыкуламі, былі цесна звязаны з атрыманне спадчыны і атрымалі свае развіццё ў рэгуляванні, былі атрыманне пасагу і запіс вена. Статут 1529 г. адлюстроўваў нормы звязаныя, напрыклад, з адсутнасцю вена. Так, удава, якая мела вена павінна была застацца толькі на ім, а сыны павінны былі атрымаць усю бацькоўскую рухомую і не рухомую маёмасць, а ў выпадку, калі ўдава вена не мела, то мела права на роўную са сваімі дарослымі дзецьмі частку маёмасці [5, р. 4, арт. 1]. Статут 1529 г. таксама ўвёў прававую норму аб тым, што бацька павінен запатрабаваць запіс вена пры выдачы дачкі замуж [5, р. 4, арт. 8]. Таксама ў гэтым Статуце азначаліся правілы запісу пасагу і яго размеркавання паміж дочкамі як пры жыцці, так і пасля смерці бацькоў.

Наступнымі відамі рэгулявання маёмасных адносін, якія знайшлі адлюстраванне ў Статутах ВКЛ з’яўляецца купля-продаж і залог (застава, заклад) маёмасці. Залогу падлягала як рухомая, так і не рухомая маёмасць. Артыкулы Статутаў замацоўвалі абавязкі і правы залогадавальніка і залогатрымальніка, працэдуру афармлення залогу, механізм і тэрміны выкупу залогу. Так, Статут 1529 г. прадугледжваў ільготны гадавы тэрмін выкупу закладзенай маёмасці пры некаторых абставінах, права выкупу закладзенай маёмасці да сканчэння зазначанага ў дагаворы тэрміна і іншыя нормы. У Статутах 1566 і 1588 гг. рэгуляванне залогавых адносін атрымала далейшае развіццё: некаторыя нормы былі дапоўнены, або запісаны больш дакладна, акрамя таго былі ўведзены новыя. Так Статутам 1588 г. напрыклад, было ўведзена новае палажэнне, якое вызначала парадак і спосаб доказу дагавору закладу нерухомай маёмасці, складзенага пасля прыняцца Статута 1529 г. і заяўленага суду да выдання Статута 1588 г.; былі вызначаны парадак кампенсацыі пазыковых абавязацельстваў на выпадак смерці даўжніка і іншыя новаўвядзенні.

Што датычыцца такога віду рэгулявання маёмасных адносін як купля-продаж, то ў Статуце 1529 г. нормы, якія закраналі гэты від адносін былі размешчаны ў некалькіх яго раздзелах. Ужо ў Статуце 1566 г. з'явіўся яшчэ і асобны раздзел «Аб запісах і продажах», які з большага рэгламентаваў механізмы закладу маёмасці, аднак закранаў і некаторыя асаблівасці куплі–продажу маёмасці. Статутам 1529 г. быў замацаваны дазвол поўнасцю распараджацца толькі 1/3 часткай сваёй нерухомай маёмасці (отдать, продать, подарить, обменять, записать) пасля адпаведных пісьмовых працэдур. У чэрвені 1566 г. Берасцейскі сойм прыняў закон аб неабмежаваным распараджэнні маёнткамі, які быў унесены ў Статут 1566 г., а потым і ў Статут 1588 г. [6, р. 2, арт. 41]. Сярод новых норм, унесеных у Статут 1588 г. быў артыкул, які рэгуляваў пытанні спынення тэрмінаў пераносу запісаў куплі, дарэння і іншых запісаў з кніг гродскіх у кнігі земскія ў выпадку надзвычайных абставін [6, р. 7, арт. 3].

Побач з такім відам рэгулявання маёмасных адносін як купля-продаж у Статутах таксама пазначаны такія віды як мена і дарэнне. Як адзначае Т. І. Доўнар дагавор мены ў гістарычным развіцці папярэднічаў дагавору куплі-продажу [4, с. 59]. Мена магла ажыццяўляцца як па дамове паміж прыватнымі землеўласнікамі, так і паміж вялікакняжацкімі землямі і землямі шляхты, што знайшло адлюстраванне ў адпаведным артыкуле Статута 1588 г. [6, р. 3, арт. 50]. Такі від рэгулявання маёмасных адносін як дарэнне ў Статутах у першую чаргу звязаны з падараваннем нерухомай дзяржаўнай маёмасці за службу вялікім князем шляхце, а таксама з падараваннем пэўных рэчаў праз тастаменты (напрыклад ахвяраванне на карысць царквы).

Сярод відаў рэгулявання маёмасных адносін, якія знайшлі адлюстраванне ў Статутах можна адзначыць арэнду і трыманне. У Статутах згадваецца як арэнда маёмасці, так і людзей (найм). Вялікі князь мог даць у пажыццёвае або спадчыннае трыманне маёмасць. У Статутах таксама была замацавана часовае трыманне маёмасці: апекуном да непаўналецця спадчыннікаў,ураднікамі вялікага князя да канца судовай спрэчкі.

Наступным відам рэгулявання маёмасных адносін з'яўлялася канфіскацыя маёмасці. Так, Статут 1529 г. прадугледжваў канфіскацыю дзяржавай маёмасці (спадчыннай, выслужанай, набытай) у выпадку збегу ўласніка ў варожыя землі [5, р. 1, арт. 2], не прыбыцця ў час на ваенную службу пад харугву свайго павета, заўчаснага пакідання ваеннай службы без дазволу гетмана і інш. [5, р. 2, арт. 1–2, 4, 10–12]. Статуты 1566 і 1588 гг. захавалі такі від рэгулявання маёмасных адносін. Паводле Статута 1588 г. уцякач з поля бітвы губляў і маёнтак і гонар [6, р. 2, арт. 14] (па Статуту 1566 г. уцякач першы раз губляў толькі маёнтак, а калі справа паўтаралася, то

губляў яшчэ і гонар) [3, р. 2, арт. 14]. Згодна са Статутам 1588 г. да харунжага, які самавольна вызваліў шляхціца ад ваеннай службы не прымяняла канфіскацыя маёмасці, толькі пазбаўленне пасады.

Пазначаны ў Статутах 1566 і 1588 гг. і такі від рэгулявання маёмасных адносін як падзел. У першую чаргу гаворыцца аб падзеле маёмасці паміж братамі пасля ўступлення ў спадчыну, вызначаюцца асаблівасці рэгулявання падзелу [5, р. 8, арт. 19; 3, р. 9, арт. 17; 6, р. 9, арт. 26].

У Статутах намі была вызначана заканадаўчая магчымасць рэгулявання маёмасных адносін як у вуснай, так і пісьмовай форме. Па звычаёваму праву здзелкі заключаліся звычайна ў прысутнасці вартых даверу сведак і суправаджаліся выкананнем пэўных рытуальных дзеянняў (рукабіццё, памятнае, магарыч). З XVI ст. пісьмовая форма рэгулявання маёмасных адносін пачынае пераважаць над вуснай. Акрамя таго, пэўнымі нормамі Статутаў было прадугледжана, каб пісьмовае рэгуляванне маёмасных адносін у некаторых выпадках было засведчана інстытутамі ўлады (вялікім князем, земскім і іншым судом) [6, р. 7, арт. 1]. Калі заканадаўчымі актамі не была замацавана пісьмовая форма рэгулявання маёмасных адносін, то магла выкарыстоўвацца вусная форма [4, с. 11].

Статутам 1529 г. была замацавана неабходнасць рэгулявання ў пісьмовай форме пагадненняў аб нерухомай маёмасці, закладзе, запісу вена, тастамента [5, р. 1, арт. 15, 17, р. 4, арт. 1, 3]. Таксама першым Статутам была зацверджана неабходнасць пісьмовага замацавання дамоў аб пазыцы коштам на суму больш за 10 коп грошаў. Статутам 1566 г., пацверджана рэгуляванне ў пісьмовай форме куплі-продажу нерухомай маёмасці, афармлення запісу вена і іншых [3, р. 7, арт. 25, р. 5, арт. 1–3, 15–17]. Статут 1588 г. прадугледжваў, што маёмасны дакумент павінен спачатку быць асабіста падпісаны, потым засведчаны подпісамі і пячаткамі трох-чатырох шляхціцаў, пасля гэтага гэты дакумент было патрэбна асабіста засведчыць «перед нами господарем, або перед врядом нашим земским». Статутам 1588 г. была таксама ўведзена норма аб неабходнасці афармлення ў пісьмовай форме афармлення дагавору зберагання маёмасці ў прысутнасці сведак [6, р. 7, арт. 25, р. 5, арт. 1–3, 15–17]. У Статутах сустракаюцца такія віды пісьмовых маёмасных крыніц як тастамент, вмова (дамова), ліст, запіс вяноўны і іншыя.

Такім чынам можна азначыць, што заканадаўствам ВКЛ на працягу XVI ст. былі глыбока рэгламентаваны маёмасныя адносіны феадальнага грамадства. У Статутах ВКЛ знайшлі адлюстраванне такія віды рэгулявання маёмасных адносін як атрыманне ў спадчыну, атрыманне пасагу, запіс вена, заклад, купля-продаж, мена, падараванне, арэнда, трыманне, канфіскацыя, падзел. Віды рэгулявання маёмасных адносін як з рухомай, так і з нерухомай маёмасцю спазналі ў Статутах пэўную эвалюцыю

і фармалізацыю. У Статутах 1566 і 1588 гг. былі дабаўлены пэўныя артыкулы, якія закраналі ты ці іншыя віды рэгулявання маёмасных адносін, існуючыя артыкулы былі адрэдагаваны і дапоўнены новымі асаблівасцямі. Рэгуляванне маёмасных адносін магло ажыццяўляцца як у вуснай, так і ў пісьмовай форме, якая з цягам часу стала пераважаючай.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Бардах Ю.* Литовские Статуты — памятники права периода Возрождения // Культурные связи народов Восточной Европы в XVI в.: Сб. ст. М., 1976. С. 71–93.
2. *Дзербіна Г.* Права і сям'я ў Беларусі эпохі Рэнесансу. Мінск: Тэхналогія, 1997. 174, [1] с.
3. *Доўнар Т. І.* Грамадзянскае права феадальнай Беларусі XV–XVI стагоддзяў. Мінск: БДУ, 1997. 84 с.
4. *Доўнар Т. І.*, *Сатолін У. М.*, *Юхо Я. А.* Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года. Рэдкалегія Т. І. Доўнар і інш. Мн.: Тэсей, 2003. 352 с.: ил.
5. Статут Великого Княжества Литовского 1529 года / Академия наук Белорусской ССР, Отдел правовых наук. Минск : Издательство Академии наук БССР, 1960. 253 с.
6. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Давед. Камент. / Беларус. Сав. Энцыкл.; Рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. Мн.: БелСЭ, 1989. 573 с.: іл.
7. *Юхо Я. А.* Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі / Я. А. Юхо. Мінск: Універсітэцкае, 1992. 269, [1] с.